культуры. Яны наладжваюць вясковыя вячоркі. І адбываецца гэта не на нейкай сцэне, а тут, у двары оялянскай хаты. Музыка, песні, гульні чаргуюць адно другога. Непасрэдная атмасфера, якую ствараюць выканаўцы, заахвочвае і выклікае жаданне самому прыняць удзел у адбываючымся дзеянні. І вось зноў гучыць музыка, "ояляне" пачынаюць танцаваць, і калі "паказаны" рухі і малюнак танца поўнасцю, яны запрашаюць сабе ў партнеры ўжо гледачоў, зразумела, не пытаючыся іх нацыянальнай прыналежнасці і ведання эстонскіх народных танцаў. Простыя рухі дазваляюць лёгка, без цяжкасцей уліцца ў агульны карагод танцуючых. Узнікае адчуванне прысутнасці не на канцэрце аматараў аўтэнтычнай эстонскай культуры, а на сапраўдным свяце.

Вось добры прыклад спалучэння клопату аб мінулым і, галоўнае, аб будучым са стварэннем умоў зацікаўленасці і жадання кожнага чалавека ведаць і магчы карыстацца сваей нацыянальнай культурай. Там, дзе нацыянальныя традыцыі моцныя, там і значна дабратворней уплыў культурнай спадчыны на моладзь, на выхаванне у ей з ранняга дзяцінства культурных, эстэтычных густай, норм зносін, патрыятызму, у цэлым. Вось, і раней названыя шляхі і павінны опрыяць сям'і, якая па трапнаму выказванню Б.Ананьева, з'яўляецца асяроддзем найбліжэйшага развіцця, стаць асноўным сацыяльным інстытутам, як у былыя часы, дзе б не толькі перадаваліся этнічныя традыцыі, але і дзейнічала б традыцыйная культура.

Надзенную задачу адраджэння народнай культуры трэба ўспрымаць у прамым сэнсе, бо адраджэнне - значыць аднаўленне, падняцце пасля заняпаду. Такім чынам, зараз трэба падтрымліваць развіцце аўтэнтычных форм бытавання народнай творчасці, але поруч і з развіццем сучасных форм мастацкай культуры.

## СЦЭНІЧНАЕ ЎВАСАБЛЕННЕ І ПАПУЛЯРЫЗАЦЫЯ НАРОДНА-ІНСТРУМЕНТАЛЬНАЙ МУЗЫКІ НА ПРЫКЛАДЗЕ АНСАМБЛЯ НАРОДНАЙ МУЗЫКІ "СЬВЯТА"

С.І.Скарабагатая

Нягледзячы на актыўную музычную дзейнасць некаторых прафесійных калектываў, такіх як інструментальная група ансамбля "Ха-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рошкі" і г.д., было недастаткова для папулярызацыі чыста інструментальнага жанру фальклорнага напрамку, так як інструментальны фальклор недастаткова вывучан спецыялістамі і не быў прадстаўлен на прафесійнай сцэне. У сувязі з гэтым узнікла неабходнасць стварэння прафесійнага калектыва, які быў бы не толькі сцэнічнай адзінкай, але і лабараторыяй для вывучэння фальклорнай інструментальнай творчасці Беларусі. Таму і быў створан ансамбль народнай музыкі "Сьвята" у жніўні 1984 года пры Беларускай дзяржаўнай філармоніі пад кіраўніцтвам заслужанага артыста Беларусі В.А.Купрыяненка.

Разглядаючы народна-інструментальнае выкананне ансамбля "Сьвята", не трэба абмяжоўвацца толькі яго аналізам. Выкананне на народных інструментах неразрыўна звязана з песнямі і танцамі, таму ўсе інструментальныя п'есы спрадвеку ствараліся на аснове песенна-танцавальных мелодый. Такім чынам, звяртаючыся к вывучаным праблемам сцэнічнага ўвасаблення і папулярызацыі народна-інструментальнай музыкі ансамблем, неабходна дакрануцца да шэрагу пытанняў, звязаных з песенна-танцавальнымі традыцыямі і іх методыкай.

Нам вядома, што народная музыка была адасоблена, яна не мае патрэбы ў развіцці, можна імправізаваць на ту ці іншую тэму, т.ч. ствараць варыянтнасць тэм, але не выходзячы з гэтага лада. Можна выкарыстоўваць цытаваны народны матэрыял, але яго абавязкова трэба спачатку паказаць такім, які ён існуе. У ходзе сцэнічнага ўвасаблення трэба выкарыстоўваць народныя прыёмы развіцця, аднак яны, на жаль, яшчэ слаба вывучаны. Расшыфроўка самабытных твораў сама за сябе гаворыць, што ў іх можна знайсці асноўныя прынцыпы народнага музыцыравання. Уцісківанне ў агульнапрынятыя рамкі або "прыглажванне", "акульцыраванне" наносіць непапраўную шкоду народнай музыцы. Уніфікацыя становучага выніка не прыносіць, яна толькі змяняе да непазнавальнасці дыялектнасць, самабытнасць, знішчаецца само паняцце "народная музыка".

Па меркаванню кіраўніка ансамбля "Сьвята" В.А.Купрыяненка: "...аўстра-нямецкая сістэма музычнага адукавання, якая цяжарам лягла на народнікаў-прафесіяналаў, не давала магчымасці працаваць у напрамку аўтэнтычнага фальклору. Трэба сказаць, што ў пераважнай большасці краін няма паняцця "прафесійнага музычна-

га фальклора", там існуюць гурты з любіцеляў, якія у свабодны час спяваюць, іграюць і танцуюць так, як гэта існуе ў іх народзе. Сярод іх могуць быць прафесійныя музыкі і спевакі, але ж яны адразу трансфарміруюцца ў народнае мастацтва, таму што яны гэта адчуваюць, іх к гэтаму цягне. Прафесійнае "народнае мастацтва" нанесла і наносіць цяжкі удар па аўтэнтычнаму фальклору, таму што, адарваўшыся ад сапраўднага і не ведаючы яго глыбінь, пачынаюць "развіваць" фальклор, стваракчы ці то лубок, ці поўакадэмічныя формы і манеры - што скажае фальклор да неспазнавальнасці, атрымліваецца той самы сурагат, які не патрэбен ні народу, ні нашчадкам. Працэс адраджэння павінен быў калісьці адбыцца і вось пакрысу ен пачынаецца, і гіта не проста з'ява, гэта - гістарычны працэс".

Склад ансамбля "Сьвята" і яго інструментарый быў выбран на аснове глыбока вывучаных старадаўніх беларускіх нацыянальных інструментаў, існуючых у сучасны час. У выніку стараннага адбору у акамуляцыйны (сабіральны) склад ансамбля увайшлі наступныя інструменты: скрыпка, альт, басэтля (кантрабас), цымбалы (прыма, альт, дыятанічныя), гармоні (баян), духавыя: дудкі (парныя або адзіночныя), жалейкі, дуда (валынка), "акарына" (гліняны гаршочак з адтулінамі), сапелкі, трава "кмен", флейта, кларнет; ліры - смычковая і калесная.

Кіраўнік ансамбля В.А.Купрыяненка выказвае свае думкі наконт музычных інструментаў: "... музычная культура Беларусі мае шэраг агульных рыс з усімі славянскімі народамі, а у асобных выпадках не толькі са славянскімі народамі. Гэта тычыцца музычных інструментаў, а трэба сказаць, што інструменты аэрафонныя, струнныя, клавішныя ва усіх народаў адрозніваюцца толькі формай, гукамі, ладам і манерай выканання, а у астатнім маюць агульныя рысы. Не складана зразумець, што арыгінальная, свая народная музыка мае агульначалавечае значэнне і дапаўняе, як арыгінальная музычная культура, сусветную народную скарбніцу. Гэта ансамбль адчувай па гастролях далека за межамі Беларусі".

Указальны агульны лік інструментаў, уваходзячых у склад ансамбля, разлічаны на больш поўны сучасны склад. Аднак, такія вялікія ансамблі народных інструментаў не характэрны для беларускага інструментальнага фальклора. Таму шэраг музычных нумароў у



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

рэпертуары напісаны для невялікіх ансамбляў, са складам інструментаў, найбольш характэрным для беларускага фальклорнага ансамбля. Напрыклад, "Хто у лесе гукае" - інструментальны нумар, дзе выкарыстоўваюцца інструменты: скрыпка альт, трава "кмен" (арганны пункт) і дудка; старадаўнія беларускія полькі для невялікага склада: скрыпка - альт - цымбал; гармоніка - кларнет; гармошка - дудка (як гэта існавала у народзе); "Ах ты, дудка мая" - для тэнара, ліры і жалейкі; "Сайка ды Грышка" - музычная кампазіцыя, дзе у аснове выкарыстоўваецца дуда з яе праніэлівым, гнусавым гучаннем, асаблівасці каларыт прыдае гучанне розных дудак (адзіночная, парная), трава "кмен" вядзе музычны дыялог з кларнетам.

Сюіта і кампазіцыі складаліся з папулярнай народнай музыкі і песень, а лепшыя народныя выканаўцы гэтых твораў былі і яшчэ жывыя, каб не парушалася тое жывое, што з'вязывала артыстаў з выканаўцамі з народа. Кожны нумар праграмы меў свайго інфарматара, які мог сказаць - праўда гэта гучыць, ці не.

Напрыклад, кадрыля Літвінчука, складаемая з 5 кален (частак), запісаная ад 96-гадовага скрыпача-самавучкі Літвінчука і носіць назву свайго інфарматара; кадрыля Яцухна, таксама з 5 частак, у праграме гучыць 5 частка гэтай кадрылі, якая носіць назву "Галоп" (віртуозная п'еса). Інфарматар - скрыпач-самавучка Яцухна і г.д.

Асноўную манеру музыцыравання ансамбля можна назваць бінарнай: з аднаго боку у большай ступені прысутнічае аўтэнтычнасць выканання, а з другога боку - расшыфроўка запісаў і апрацоўка іх, аранжыроўкі мелодый у народным плане, выкананне па нотам (але варыянтна). Пры асваенні аўтэнтычнай ігры таго ці іншага рэгіона Беларусі (вобласці), ансамблісты улічваюць асаблівасці музычнага языка, характэрныя для дадзенай мясцовасці - гармонію, падгалосачную паліфанію, мелізматыку, варыянтнае развіцце (рысы імправізацыі), асаблівасць тэмбравых красак і спецыфічнасць рытмічнага рысунка (напрыклад, улічванне момента рытмічнай асіметрыі, акцентуацыі).

Складанасць подлінна аўтэнтычнай народнай манеры музыцыравання абумоўлена некалькімі прычынамі: неафальклорныя калектывы, да якіх і адносіцца ансамбль "Сьвята", складаецца з му-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выканаўцаў, маючых акадэмічную музычную адукацыю і валодаючых удасканаленымі (храматычнымі) народнымі інструментамі еўрапейскага акадэмічнага мастацтва (скрыпка, флейта, кларнет, цымбалы, баян). У выніку прафесійнага навучання ігры на інструменце натуральна змяншаецца адносна манеры выканання народнага музыканта.

Музычная частка праграмы састаўлена на народнай музыке Прыпяці (правы бераг), раёнаў Гомельскай, Магілеўскай, Брэсцкай абласцей.

На Палессі, дзе ансамбль выступаў і рэпертуар якога асноўваўся на музыцы і песнях Беларускага Палесся, мы не раз чулі: "А, божачкі, гэта ж нашы песні, якія мы спявалі з дзяцінства, гэта ж наша музыка". А трэба сказаць, што музычны фальклор Палесся - гэта той рэлікт, які заўсёды бянтэжыў фальклардотаў і якія прыйшлі да высновы, што гэта нейкі эпіцэнтр усёй славянскай культуры, які найбольш захаваўся у тым выглядзе, як быў створаны, ну і безумоўна, дапаўняўся лепшымі выканаўцамі з народа.

А, галоўнае, народная музыка Беларусі не лічылася прыгоднай для канцэртнага выканання, а лічылася толькі бытавой, падыходзячай для танца і не больш таго, а для слухання як бы не годнай.

Спачатку і да сённяшняга дня ансамбль працаваў над праграмай, якая б адлюстроўвала ўсё набыцце музыкальнага фальклору народа Беларусі ў розных яго жанрах музыкі, песні і танца і ў іх спалучэнні, сінтэзе гэтых жанраў, таму што ў лепшых сваіх узорах і выявах народ імкнуўся да гэтага. І артыст павінен быў не толькі іграць, ці пець, але ж і рухацца на сцэне, быць акцёрам. Патрабаваліся новыя формы, якія б уздейнічалі на публіку, становячы ў плане таго, каб яна была удзельнікам гэтага свята. Гэта была асноўная задача, другая заключалася ў тым, каб музыка, песня і танец была максімальна выходзячая з народных вытокаў, не парушалася яе аўтэнтычнасць, была зразумела і пазнавальна, што называецца праўдай у народным мастацтве, натуральнасцю.

Гэта і было дасягнута, а па-трэцяе, каб нумары праграмы, кампазіцыі і г.д. успрымаліся усімі народамі і за межамі Бела-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

русі, праграма павінна была мець еўрапейскі і міжнародны ўзровень, каб у любой краіне маглі сказаць – гэта беларускае народнае мастацтва.

У ходзе вывучэння канцэртных праграм складаецца прадстаўленне аб фарміраванні некалькіх праграм, адрозніваючыхся па сцэнічнаму ўвасабленню. Разам з тым іх можна абагульніць і прыдаць ім пэўны напрамак, класіфікаваць праграмы ўмоўна.

Першая праграма – была аснована на творах класічнага традыцыйнага фальклора, складалася з 2-х аддзяленняў; першае аддзяленне – класічнае, другое – свята, вяселле ў весцы.

Другая праграма – ўмоўна складалася з 3-х частак: I-я частка – прывітальныя, яркія канцэртныя нумары; 2-я частка – лірычныя вакальныя, інструментальныя нумары; 3-я частка – фінал, папулярныя песні, жартаўлівыя кампазіцыі. Такая праграма патрабавала беспераппыннага драматычнага развіцця ў адным аддзяленні.

Трэцяя праграма пабудавана ў свабодна-сюітнай форме, мае рысы рапсадзійнасці, ўмоўна складаецца з блокаў, якія маюць скразное развіццё.

Паказ I-й праграмы ансамбля "Сывята" адбыўся 19 лістапада 1984 года. Асаблівасць яе ў тым, што у I-е аддзяленне ўвайшлі яркія узоры старажытнай беларускай музыкі. Такія, як старадаўнія кадрылі (кадрыля Яцухна, кадрыля Літвінчука, кадрыля Сіўчука), старадаўнія полькі, музыка Іванаўскага і Віцебскага раенаў, старажытныя беларускія песні (балады, а саре а).

Выкананне кадрылі Яцухна ў чатырох частках (каленах) характэрызуецца начальным гучаннем сола скрыпкі і цымбал, потым уступаюць астатнія інструменты, дзе імкліва гучанне прыводзіць к фіналу (IУ ч.) – гэта віртуозная частка пад назвай "Галоп".

Кадрыля Сіўчука упачатку была расшфравана для сола цымбал у суправаджэнні ансамбля, пазней на гэту музыку пастаўлен танец з цікавай і складанай харэаграфіяй.

Яркім узорам сцэнічнага ўвасаблення праграмы можа паслужыць старадаўняя музыка Віцебскага раена. Яна спачатку выконвалася ў якасці інструментальнага нумару пад назвай "Народная музыка Віцебшчыны". Уступ выконвала гармошка – сола, потым уступаў ансамбль. У цяперашні час на гэту музыку пастаўлена харэаграфія і гэты інструментальна-харэаграфічны нумар выконваец-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ца як заключны пад назвай "Віцебская".

Арыгінальнасцю вызначаецца старадаўняя музыка з выкарыстаннем музычнага інструмента акарыны пад назвай "Кветкі" у выкананні ансамбля 3-х інструментаў: цымбалы - скрыпка - скрыпка-альт, потым гучыць дуэт цымбалы - акарына.

Можна лічыць самым яркім нумарам музычную кампазіцыю "Саўка ды Грышка", якая паслужыць добрым прыкладам сцэнічнага увасаблення класічнага традыцыйнага фальклора. Тут прадстаўлены шматлікія старадаўнія інструменты: дуда, ліра калесная і смычковая, дудкі адзіночныя і парныя, кмен (трава), саломкі. У пачатку выканання гучыць сола дуды на тэму вядомай песні "Саўка ды Грышка", потым - сола цымбал з басам, тая ж музычная тэма, потым сола перадаецца першай скрыпцы, затым далучаюцца другая скрыпка і скрыпка-альт. Тэма развіваецца, гучаць розныя варыяцыі на галоўную тэму, наступае мадуляцыя і уступае кларнет, які гучыць у цікавым дуэце з кменам. Потым снова гучаць варыяцыі у скрыпак і у заканчэнні гучаць цымбалы з парнай дудкай, якія праводзяць галоўную тэму песні "Саўка ды Грышка".

Хацелася б адзначыць, што гэта музычная кампазіцыя адзіночная у праграме з аўтарскай апрацоўкай В.А.Купрыяненка.

Вялікую цікавасць і каштоўнасць прадстаўляе першае аддзяленне праграмы у тым, што мастацкі кіраўнік В.А.Купрыяненка дакладна выканаў асноўную задачу ансамбля ў плане гучання аўтэнтычнай музыкі. Асаблівыя нумары праграмы, такія як, напрыклад, кадрылі, старадаўнія полькі, былі выкананы у той танальнасці, у якой былі запісаны ад інфарматара.

Другое аддзяленне І-й праграмы прысвечана сьвяту у вясны. Цэнтральнае месца праграмы займалі жартоўныя песні, беларускія танцы, песні-шлягеры, таксама звяртае на сябе увагу жартоўная вакальна-харэаграфічная кампазіцыя "Каханачка", дзе спяваюць і танцуюць вакалісты. Тут таксама галоўнае месца займае кампазіцыя "Вяселле" (музыка і песні Магілеўшчыны). У ей задзействаваны усе артысты ансамбля, кожны выконвае сваю ролю. Аднак, такой мэты не ставілася, каб паказаць на сцэне увесь старадаўні абрад. Гэта кампазіцыя складалася з яркіх канцэртных нумароў. У пачатку кампазіцыі гучыць сола жаночага голаса "Ай, на двары" у суправаджэнні дуды. Потым выходзяць музыканты і выконваюць

прывітальны марш, на музыку якога выходзяць танцоры і астатнія вакалісты, якія вітаюць друг друга. Выконваюцца жартоўныя песьні, вясельныя полькі, на сцэне заўседы знаходзяцца ўсе артысты, інсцэніруюць песьні, танцуюць пад музыку, вакальныя нумары чаргуюцца з інструментальнымі і харэаграфічнымі. Заканчваецца "Вясельная кампазіцыя" фінальнай полькай, дзе весяліцца ўся "веска" (тут дэманструецца збор грошаў на "каравай", танец маладых, сватоў і г.д.).

Другое аддзяленне было кантрастна першаму не толькі па сюжэтнаму зместу, музыке, рэжысуры, але і ў адносінах да касцюмаў, якія, безумоўна, з'яўляюцца галоўнай рысай у праграме.

Вялікую цікавасць выклікае выкананне 2-й праграмы, якая пастроена па прынцыпу паступовага і бесперапыннага драматычнага развіцця з агульным аб'емам часу гучання канцэрта - паўтары гадзіны. Характэрна для гэтай праграмы тое, што амаль кожны нумар меў сваю назву і аб'яўляўся вядучым. Сама форма такога канцэрта нам вядома, але ў даным выпадку ўзнікаюць новыя задачы для кожнага артыста ансамбля, незалежна ад таго, ці музыкант, ці вакаліст або танцор, патрэбна актыўна ўдзельнічаць у праграме. Гэта ўжо нейкі адыход ад статычнасці.

Другая асаблівасць гэтай праграмы заключалася ў аб'яднанні старадаўніх традыцыйна-класічных нумароў (I праграмы) з жартоўнымі, шлягернымі песьнямі, танцамі сучаснага перыяду ў адным аддзяленні канцэрта.

Акрамя існуючых нумароў, такіх як "Вясельная кампазіцыя", жартоўная кампазіцыя "Каханачка" і г.д., з'явіліся новыя, больш цікавыя па зместу і ўспрыманню. Напрыклад, музыкальна-харэаграфічны нумар "Лапці", інструментальна-вакальны нумар "Страданні" на музыку фінала старадаўніх полек, пастроены ў форме частушак у выкананні вакалістаў, якія танцуюць разам з танцорамі. Кампазіцыя "Лявоніха" у канцэртнай праграме шла ў канцы, дзе былі задзейнічаны ўсе артысты ансамбля, а сам фінал гэтай кампазіцыі суправаджаўся танцавальнай полькай з удзелам музыкантаў, спевакоў і танцораў. Гэты нумар меў вялікі поспех у гледачоў.

Існуючая ў цяперашні час праграма пастроена па прынцыпу "поп ", у свабоднай форме. Яна ўмоўна дзеліцца на вызначаныя "блокі". Кожны блок уключае ў сябе па некалькі канцэрт-



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

ных нумароў, мае поўнае сюжэтнае развіцце. Праграма праходзіць амаль што без прыпынак, на адным дыханні, развіцце ідзе па нарастаючай.

Сёняшняя праграма ансамбля "Сьвята" з'яўляецца поўным узорам для ансамбляў с сакрытычным жанрам, дзе артысты валодаюць і танцамі і ігрой на музычных інструментах на высокім прафесійным узроўні. Апошняя праграма выкарыстоўвае амаль што усе пласты музычнага фальклору. Тут традыцыйная беларуская музыка: сюіта "Ляхавіцкія полькі", народная музыка Рудабелкі, сюіта з народнай музыкі Іванаўскага раёна, Палескі вальс. Песьні ад традыцыйнага песенна-танцавальнага жанру да песень а сары а і балад. Але ж дамінантай праграмы з'яўляюцца кампазіцыі з папулярнай народнай музыкі і папулярных песень, якія адразу успрымаюцца усімі прысутнічымі з-за іх даспіпнасці і яскравасці. Лірычныя народныя песьні кантрастуюць з жартоўнымі, вясёлымі нумарамі.

Праграма пачынаецца старадаўняй беларускай полькай "Ляхавічская", якая аб'ядноўваецца з папулярнай народнай песьняй для барытона "Зялена жыта". Тут кіраўніком ансамбля знайдзен цікавы танальны план.

"Ляхавічская" полька выконваецца не толькі як інструментальны нумар (так гучала у І-й праграме), а ўжо у другім сцэнічным увасабленні, жанравай якасьці. Выкарыстоўваецца балет, які адлюстроўвае пасядзелкі ў вёске з прытанцоўкамі і абыгрываннем нумара, гэта вельмі добра успрымаецца гледачамі.

Сярод многіх цікавых песень неабходна адзначыць лірычную песьню для жаночага голаса "Пасею чурочкі". Пасля ўступа цымбал на рі гучыць старадаўні інструмент акарына, па гучанню падобны голасу, які разам з жаночым голасам праводзіць галоўную тэму песьні. Вельмі цікавае суправаджэнне ансамбля: цымбалы і акарына на рі выконваюць акампанемент, уступ кларнета ў 3-м куплеце прыдае ўсхваляванасць. Гэту лірычную песьню змяняе віртуозны інструментальны нумар "Галоп" - фінальная частка старадаўняй кадрылі, дзе сола то ў скрыпкі, то ў флейты, то ў дудачкі, баяна, цымбал.

Зараз мастацкі кіраўнік працуе над новай канцэртнай інструментальна-харэаграфічнай кампазіцыяй "Гарманісты". Такі нумар



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

выклiкае вялiкую цiкавасць сваей традыцыйнасцю, iснуючай у вёсках Беларусi. Тут прадстаўлены 2 ансамбля (2 вёскi).

I састаў: гармонь – цымбалы – альт – кантрабас

2 састаў: гармонь – скрыпка – альт – кларнет – кантрабас

Менавiта такiя невялiкiя ансамблi iснавалi раней у Беларусi у такiм саставе. Гэтыя 2 ансамблi збiраюцца на пасядзелкi, паказваюць сваё майстэрства адзiн перад адным, стараючысь абыграць сапернiка. На першым плане, безумоўна, вiртуозная iгра гарманiстаў, якiя не толькi добра граюць, але i танцуюць. Тэмп паступова нарастае да кульмiнацыi i гучыць фiнал, дзе два ансамблi вiртуозна гучаць у адной танальнасцi. Суправаджаюцца выступленнi кожнага ансамбля танцавальнымi iмправiзацыямi.

Безумоўна, яшчэ вельмi шмат задумак, новых нумароў, над якiмi працуе ансамбль.

Ансамбль народнай музыкi "Сьвята" пачаў сваю канцэртную дзейнасць непасрэдна у Беларусi, а некалькi пазней за яе межамi. Галоўная мэта канцэртнай дзейнасцi ансамбля – гэта прапаганда беларускай народна-iнструментальнай творчасцi, якая мае старадаўнiя корнi мiнулага з багатай мелодыкай i народнай прыгажосцю. Стварэнне такога ансамбля – новая з'ява на прафесiйнай сцэне, так як на канцэртных пляцоўках на першым плане была эстрадная музыка, i не кожны глядач, асаблiва моладзь, мог сабе уявiць канцэртную праграму у дзьвух аддзяленнях, дзе гучала бы толькi народная музыка. Артысты ансамбля заўседы чулi словы удзячнасцi, шчырых пажаданняў ад гледачоў за прадстаўленае народнае мастацтва.

За 8 гадоў iснавання ансамбль прайшоў вялiкi i складаны творчы шлях станаўлення i развiцця свайго прафесiяналiзма. За гэты перыяд ансамбль праехаў усе глыбiнкi Беларусi i няма таго места, дзе б яго не ведалi. I зараз канцэртныя залы заўседы поўныя, а аудыторыю гледачоў састаўляе не толькi старэйшае пакаленне, але i моладзь, якая з каханнем слухае i успрымае музыку i песнi сваiх бацькоў i дзядоў.

I гэта вельмi прыемна, менавiта у гэты момант трэба бачыць вочы гледачоў, унутраны стан кожнага чалавека, таму што схаваць гэта немагчыма, так як народнае мастацтва тым i моцна, што яно захапляе адразу i у гэтым яго жыццевая сiла i вечнасць. Развiц-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

це ансамбля сказывала і сказвае вялікае станоўчае ўздзеянне на развіцце і адраджэнне беларускага музыкальнага фальклору ў сваёй рэспубліцы. Па шляху "Сьвята" ідуць і ствараюцца новыя ансамблі народнай музыкі. Запісы з рэпертуару ансамбля тыражыруюцца многімі мастацкімі калектывамі, для якіх напрамак "Сьвята" з'ўляецца найбольш неабходным і карысным для сцэнічнай дзейнасці. Мэту, якую ставіў перад сабой ансамбль, можна лічыць дасягнутай, калектыў даказаў, што мы - беларусы - з'ўляемся захавальнікамі багацейшай музычнай народнай культуры.

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ